# ПРЫМЯНЕННЕ ТЭХНАЛОГІІ «НАВУЧАННЕ Ў СУПРАЦОЎНІЦТВЕ» НА ЗАНЯТКАХ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)

**М. У. Буракова**

*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. В. Сухога», кафедра «Беларуская і замежныя мовы»*

Адукацыйны працэс – унікальны механізм перадачы і засваення навуковай інфармацыі, ведаў і навыкаў, сацыяльнага і прафесійнага вопыту ад пакалення да пакалення, фарміраванне асобы, яе светапогляду, асобасных якасцей, культуры. Сучасную адукацыйную сістэму немагчыма ўявіць без прымянення перспектыўных педагагічных тэхналогій. Так, «навучанне ў супрацоўніцтве» ці «навучанне ў малых групах» з'яўляецца эфектыўнай, на наш погляд, педагагічнай тэхналогіяй для гуманітарных дысцыплін у нефілалагічных вузах. Галоўнай задачай абранай тэхналогіі з'яўляецца стварэнне ўмоў для актыўнай вучэбнай дзейнасці навучэнцаў у розных вучэбных сітуацыях.

Сучасная методыка навучання беларускай мове, маючы агульную камунікатыўную накіраванасць навучання, раіць строга ўлічваць, каму і з якой мэтай мова выкладаецца. Ва ўмовах навучання мове студэнтаў у вну тэхнічных спецыяльнасцей гэты прынцып атрымаў назву «прафесійнай накіраванасці навучання». Трэба адзначыць, што для студэнтаў з тэхнічным складам розуму найбольшую цяжкасць прадстаўляе сам працэс зносін на беларускай мове, паколькі спецыфіка профільнага навучання прадугледжвае вывучэнне навукова-тэхнічнай лексікі беларускай мовы. Паступовае выцясненне беларускай мовы рускаю як з паўсядзеннага, так і з афіцыйна-адміністрацыйнага ўжывання, з аднаго боку, пашырэнне сферы выкарыстання англійскай мовы ў асяроддзі студэнцкай моладзі ў сувязі з камп'ютарызацыяй, з другога, прыводзіць да змяншэння слоўнікавага запасу беларускамоўных носьбітаў, зніжэння маўленчай культуры беларусаў, у тым ліку і найбольш выразна ў студэнтаў.

Высокія патрабаванні да студэнтаў вну як будучых спецыялістаў розных галін разлічаны на адпаведны ўзровень падрыхтоўкі іх ў сярэдняй школе, таму вельмі складана тым, хто не мае яго, паколькі ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай беларускай мовы ў вну патрабуецца «рыхтаваць не проста спецыяліста, а камунікатыўна развітую асобу, білінгвістычна падрыхтаваную, якая на дастатковым узроўні магла наладжваць зносіны на роднай мове ў прафесійна-справавой сферы».

З улікам адзначанага, прымяненне педагагічнай тэхналогіі «навучанне ў супрацоўніцтве» на занятках па беларускай мове (прафесійная лексіка) патрабуе ад выкладчыка ўвагі да наступных аспектаў: 1) упэўненасць выкладчыка ў дастаковым узроўні ведаў і навыкаў студэнтаў, неабходным для выканання групавых заданняў; 2) інструкцыя выкладчыка павінны быць максімальна дакладнай (лепш, калі яна запісана на дошцы ці на картках); 3) выдзяленне дастатковага часу на выкананне задання.

**План заняткаў па тэхналогіі «навучанне ў супрацоўніцтве»**

| № п/п | Ход заняткаў | Дзейнасць студэнтаў | Час |
|---|---|---|---|
| 1 | Арганізацыйны момант, падзел групы студэнтаў на мікрагрупы (па 5–6 чалавек) | Падрыхтоўка да заняткаў, падзел студэнтаў на каманды з выбарам у іх лідэра | 10 хв. |

*Канец табліцы*

| № п/п | Ход заняткаў | Дзейнасць студэнтаў | Час |
|---|---|---|---|
| 2 | Самастойная работа ў мікрагрупах | Пошук інфармацыі ў падручніках і метадычных дапаможніках, запіс у сшыткі | 40 хв. |
| 3 | Даклад студэнтаў перад групай | Выступленне студэнта-лідэра каманды | 20 хв. |
| 4 | Ацэньванне дакладчыкаў. Фармуляванне агульнага вываду заняткаў і запіс дамашняга задання | Ацэньванне работы кожнай каманды студэнтамі. Запіс дамашняга задання | 20 хв. |

Праблема матывацыі самастойнай дзейнасці студэнтаў з'яўляецца першаснай. Матываваць дзейнасць студэнтаў можна не толькі абяцаннем пастаноўкі выніковай ацэнкі «аўтаматам», але і заданнямі, пабудаванымі з некаторымі элементамі гульні. Так, напрыклад, для будучых энергетыкаў прадстаўляе цікавасць складанне пытанняў да красворду па ключавых тэрмінах, паняццях, камандах і г. д. У такіх практыкаваннях выпрацоўваюцца як лексічныя, так і граматычныя ўменні, навыкі пісьма, логікі, увагі, памяці.

Акрамя таго, у кожнай мікрагрупе (камандзе) заўседы знойдуцца студэнты з дастатковым узроўнем ведаў, здольныя дапамагчы менш падрыхтаваным студэнтам. Пры гэтым выкладчык выступае ў ролі каардынатара. Пасля выканання заданняў усімі мікрагрупамі (камандамі) праводзіцца сумеснае абмеркаванне вынікаў. Ацэнкі ці балы за самастойную работу сумiруюць у групе, і аб'яўляецца агульная ацэнка на групу. Такім чынам, улічваецца ўклад кожнага студэнта.

Выкарыстанне педагагічнай тэхналогіі «навучанне ў супрацоўніцтве» на занятках па беларускай мове (прафесійная лексіка) у вну нефілалагічнага накірунку паказала высокі ўзровень падрыхтоўкі на працягу 2010/2011 навучальнага года ў параўнанні са стандартнымі заняткамі. Матэрыял, прапрацаваны ўсімі студэнтамі групы шляхам абмеркавання, пытальна-адказнай формай, засвойваецца і запамінаецца лепш. Такім чынам, з'яўляецца матывацыя студэнтаў працаваць самастойна на наступных занятках. Такія зносіны сацыяльныя, паколькі ў працэсе іх навучэнцы выконваюць розныя сацыяльныя ролі: лідэра, выканаўцы, арганізатара, дакладчыка, эксперта, даследчыка і г. д. Адкрываюцца здольнасці тых студэнтаў, якія па тых ці іншых прычынах застаюцца заўседы на занятках «у цяні». Такія студэнты на занятках пры стандартнай форме правядзення заняткаў не задзейнічаны, так як для іх з'яўляюцца праблемнымі зносіны з выкладчыкам. «Навучанне ў супрацоўніцтве» дапамагае вырашыць даную праблему і актывізаваць дзейнасць такіх студэнтаў у поўным аб'еме.

Такім чынам, сучасны падыход да навучання і выхавання немагчымы без выкарыстання педагагічных тэхналогій. І няхай гэта не заўседы будзе выкарыстанне не ва ўсім яе аб'еме, а толькі якіх-небудзь яе элементаў, заняткі набудуць нестандартную займальную форму для студэнтаў, а для выкладчыка – высокія паказчыкі падрыхтоўкі студэнтаў. Кіруемся тым прынцыпам, што самай галоўнай педагагічнай тэхналогіяй з'яўляецца тэхналогія «навучанне поспехам».